ДУК “Мазырская цэнтральная раённая бібліятэка імя А.С. Пушкіна”

Сектар краязнаўства

аддзела абслугоўвання і інфармацыі

# Старонкі гісторыі Мазыршчыны



## Каляндар памятных дат і падзей на 2022 год

http://gallery.mozyrlib.by/

# Каляндар памятных дат
# і падзей на 2022 год

## Агульныя даты

**590 гадоў** з часу першага ўпамінання (1432г.) аб в. Міхалкі, Барбароў, с. Мялешкавічы.

**455 гадоў** з часу заснавання ( 1567г.) в. Вялікія Зімовішчы, в. Стрэльск, в. Тварычаўка.

**430 гадоў** з часу Галоўнага Літоўскага Трыбунала над Стэфанам Лованам - мазырскім земскім суддзёй.

**375 гадоў** з часу заснавання (1647г.) ў Мазыры жаночага каталіцкага манастыра Ордэна Марыявітак.

**350 гадоў** з часу (1672г.) пісьмовага ўпамінання аб в. Акулінка.

**320 гадоў** з часу (1702г.) першага пісьмовага ўпамінання аб в. Бярозаўка.

**250 гадоў** з часу (1772г.) адкрыцця ў Мазыры найніжэйшай трохкласнай школы.

**245 гадоў** з часу (1777г.) упамінання аб в. Гдініца.

**220 гадоў** з часу (1802г.) пісьмовага упамінання аб в. Антонаўка.

**220 гадоў** з дня нараджэння (1802 г.) удзельніка паўстання 1830-1831 гг. на Беларусі Ф. Кеневіча, ураджэнца Мазыршчыны.

**210 гадоў** з часу ўдзела (1812г.) насельніцтва Мазыршчыны ў баявых дзеяннях з французскай арміяй.

**175 гадоў** з часу (1847г.), як в. Майсееўка ў складзе маёнтка Прудок, уласнасць Ляневічаў.

**150 гадоў** з дня нараджэння Саета Гаўрылы Яўхімавіча (1872г. - 26.12.1919г.), аднаго з арганізатараў аховы здароўя ў Мазыры. Яго імем названа адна з вуліц Мазыра. Залічаны ганаровым урачом Мазырскай гарадской бальніцы.

**130 гадоў** з часу (1892г.) трэццяга вялікага пажару ў г. Мазыры.

**125 гадоў** з часу (1897г.) перапісу насельніцтва ў г. Мазыры і Мазырскім павеце.

**120 гадоў** з часу (1902г.) адкрыцця фанернай фабрыкі “Прыма”.

**115 гадоў** з часу (1907г.), калі адбыўся першы прыём навучэнцаў у Мазырскую рамесную школу.

**115 гадоў** з часу адкрыцця (1907г.) чатырохкласнага навучальнага вучылішча ў Мазыры.

http://gallery.mozyrlib.by/

**110 гадоў** назад (1912г.) пачалося будаўніцтва фанерна-дрэваапрацоўчага завода ў Целепунах

**100 гадоў** часу стварэння (1922г.) першых калектыўных гаспадарчых уладанняў зямлёй: арцель "Сіла" (в. Прудок), "Чырвоная зорка" (в. Лешня)

**100 гадоў** з часу стварэння (1922г.) Мазырскага народнага тэатра гарадскога Дома культуры. Званне народнага прысвоена ў 1960г. У 1990г. на яго аснове створаны прафесійны эксперыментальны тэатр "Верасень", які ў 1994г. перайменаваны ў Мазырскі драматычны тэатр імя І. Мележа

**100 гадоў** з часу заснавання (1922г.) "Хуткай дапамогі" Мазырскага раёна

**95 гадоў** з часу заснавання (1927г.) Мазырскай трыкатажнай фабрыкі "Славянка" як панчошнай арцелі імя Н.К.Крупскай

**95 гадоў** з часу пераўтварэння (1927г.) пясчанай станцыі ў в. Скрыгалаў у сельгастэхнікум.

**90 гадоў** з часу (1932г.), калі была адкрыта транспартная авіялінія Мінск - Глуск - Парычы - Мазыр, першая ў Беларусі

**90 гадоў** з часу заснавання (1932г.) Мазырскага хлебазавода. З 2001г. Філіял Руп "Гомельхлебпрам"

**85 гадоў** занальнаму цэнтру гігіены і эпідэміялогіі (1937 г.), была створана Мазырская санітарная станцыя, якая абслугоўвала ўсю Палескую вобласць

**85 гадоў** з часу адкрыцця (1937г.) у Мазыры двухгадовай школы медсясцёр (цяпер Мазырскі дзяржаўны медыцынскі каледж)

**70 гадоў** з часу адкрыцця (1952г.) Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І.П.Шамякіна. Заснаваны ў Мазыры на базе настаўніцкага інстытута (1944-1952гг.).
З 2002г. - універсітэт. У 2006г. прысвоена імя І.П. Шамякіна.

**60 гадоў** з часу адкрыцця(1962г.) У.Ф. Ісаенкам археалагічнага помніка "Загорыны" - паселішча і гарадзішча каля в. Загорыны Мазырскага раёна

**45 гадоў** з часу ўзвядзення (1977г.) мемарыяла "Курган Славы"

**40 гадоў** з часу заснавання (1982г.) Мазырскага солевыварачнага камбіната. З 1997 г.ААТ "Мазырсоль"

**30 гадоў** з часу стварэння (1992г.) Мазырскай мытні

**25 гадоў** з часу заснавання (1997г.) Мазырскага маладзёжнага тэатра сатыры і гумару "Ком-Ікс" гарадскога Дома культуры

**20 гадоў** з часу заснавання (2002г.) народнага маладзёжнага тэатра "Легион"

**15 гадоў** з часу аб'яднання Мазырскага гарадскога выканаўчага камітэта з Мазырскім раённым выканаўчым камітэтам

http://gallery.mozyrlib.by/

## Студзень

**4** – 60 гадоў з часу заснавання (1962г.) Мазырскага вопытнага лясгаса

**9** – 70 гадоў з дня нараджэння Ганчаровай Валянціны Сцяпанаўны (н. 09.01.1952г., в. Мікулічы Брагінскага раёна), беларускага народнага майстра па пляценню з лазы і саломы. Народны майстар Рэспублікі Беларусь. Узначальвала Мазырскі раённы Цэнтр рамёстваў.

**15** - 70 гадоў з дня нараджэння Дубровы Мікалая Кузьміча (н. 15.01.1952г., в. Бярозаўка Мазырскага раёна - 15.12.2017г.), беларускага мастака. Член Беларускага саюза мастакаў (1988г.). Працаваў ў станкавай і кніжнай графіцы, станкавым жывапісе.

**16** – 115 гадоў з дня нараджэння Захаравай Алены Іванаўны (н. 10.01.1907г., Мазыр - 02.10.1999г.), вучонага ў галіне вінаградарства і вінаробства. Доктар сельскагаспадарчых навук. Прафесар.Двойчы лаўрэат Дзяржайўнай прэміі (1951, 1971гг). Заслужаны аграном Расіі. Узнагароджана ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў, Знак Пашаны і 14 медалямі.

**28** – 445 гадоў з часу (1577г.), калі кароль Стэфан Баторый выдаў Мазыру прывілей на поўнае Магдэбурскае права.

## Люты

**13** – 140 гадоў са дня смерці Гельфман Гесі Мееравўны - рэвалюцыянеркі-народніцы, ураджэнкі г. Мазыра.

**21** – 75 гадоў з дня нараджэння Фінберга Міхаіла Якаўлевіча (н. 21.02.1947г.), беларускага дырыжора. Прафесар Беларускай акадэміі музыкі. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1990 г.). Народны артыст Беларусі (1990г.), лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1990г.), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1996г.). Ганаровы грамадзянін Мазыра (2005г.) і Нясвіжа (2006г.) На Плошчы зорак у Маскве закладзена імянная зорка М. Фінберга (2004г.).

## Сакавік

**7** – 55 гадоў з часу нараджэння Мажэйкі Уладзіміра Мікалаевіча (н. 07.03.1967г., г. Мазыр), беларускага спартсмена (веславанне на байдарках і каноэ). Майстар спорту СССР міжнароднага класа (1987г.). Бронзавы прызёр чемпіянату свету (1989г., г. Познань, Польшча) на байдарцы-двойцы.

**23** – 65 гадоў з дня нараджэння Дарошкі Таццяны Міхайлаўны

http://gallery.mozyrlib.by/

(н. 23.03.1957г. в. Фалічы Старадарожскага р-на), паэткі, члена Беларускага літаратурнага саюза “Полоцкая ветвь”.

## Красавік

**5** – 70 гадоў з дня нараджэння Міцюрыча Георгія Сямёнавіча (н. 05.04.1952г., г. Мазыр - 28.12.2020г.), беларускага вучонага ў галіне лазернай фотаакустыкі. Доктар фізіка-матэматычных навук (1998г.). Прафесар (2003г.). З 2002 г. працаваў ў Беларускім гандлёва-эканамічным універсітэце спажывецкай кааперацыі. Аўтар больш за 130 навуковых прац.

**10** - 110 гадоў з дня нараджэння Ціханава Рыгора Мацвеевіча (10.04.1912г. - 13.02.1944г.), Героя Савецкага Саюза. Удзельнік вялікай Айчыннай вайны. Загінуў пры вызваленні Мазыра, дзе на Кургане Славы яму устаноўлена мемарыяльная пліта.

**17** – 70 гадоў з дня нараджэння Зайцавай Надзеі Уладзіміраўны (н. 10.04.1952г., г. Мазыр), беларускага педагога. Доктар педагагічных навук (2004г.). З 1988 г. працуе ў Мазырскім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя І.П. Шамякіна

## Май

**7** – 105 гадоў назад пачала выходзіць газета “Известия” Мазырскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў

**12** – 80 гадоў з дня нараджэння Бароўскага Анатолія Мікалаевіча (н. 12.05.1942г., в. Крушнікі Мазырскага раёна), беларускага пісьменніка. Лаўрэат прэміі часопіса “Маладосць” за нарыс “Поле Радкевічаў” (1980г.). Жыве ў Гомелі.

**13** – 400 гадоў з дня смерці Івана Мялешкі (1552г.-10.05.1622 гг.) - дзяржаўнага і ваеннага дзеяча ВКЛ. С 1589г. жыў і працаваў у г. Мазыры галоўным межавым суддзёю. Займаўся размежаваннем у Мазырскім павеце з 1598 па 1601 гг.

**24** – 45 гадоў з дня нараджэння Гуршчанковай Алесі Мікалаеўны (н. 24.05.1977г., г. Мазыр), скульптара. Працуе ў станкавай і манументальнай скульптуры. Удзельнік мастацкіх выстаў (1996г.). Лаўрэат конкурсу рэспубліканскай выставы візуальных мастацтваў “ART-Sessio2000” у Віцебску (2000г.). Жыве ў Брэсце.

## Чэрвень

**3** – 105 гадоў з дня забастоўкі рабочых фанернай фабрыкі “Прима”.

http://gallery.mozyrlib.by/

**12** - 85 гадоў з дня нараджэння Сузько Міхаіла Іванавіча (н. 12.06.1937г., в. Козенкі Мазырскага раёна - 4.10.1986г.), трактарыста калгаса “Радзіма”. Дэпутат Баброўскага сельскага Савета.

**14** – 75 гадоў з дня нараджэння Каляды Александра Рыгоравіча (н. 14.06.1947 г., в. Салтанаў Рэчыцкага раёна), беларускага паэта. Члена саюза пісьменнікаў Беларусі (2006 г.)

**14** – 155 гадоў з дня нараджэння Доўнара-Запольскага Мітрафана Віктаравіча (1867 - 30.09.1937 г.) - гісторыка, этнографа, фалькларыста, літаратуразнаўца (1905г.), прафесара (1902 г.), вучыўся у Мазырскай гімназіі. Навукова-літаратурную дзейнасць пачаў яшчэ ў Мазырскай гімназіі пад час навучэння.

**17** - 65 гадоў з дня нараджэння Шантаровіча Уладзіміра Уладзіміравіча (н. 17.06.1952г.), ганаровага грамадзяніна г. Мазыра (2003г.). Заслужаны трэнер БССР (1982г.).

**18** – 90 гадоў з дня нараджэння Ганчара Рыгора Фядосавіча (н. 18.06.1932г., в. Дарашэвічы Петрыкаўскага раёна), ганаровага грамадзяніна г. Мазыра (1994г.)

## Ліпень

**7** – 70 гадоў з дня нараджэння Савенкі Уладзіміра Сямёнавіча (н. 07.07.1952г., г. Мазыр), беларускага вучонага ў галіне фізікі. Доктар тэхнічных навук (2003г.), прафесар (2000г.), працуе ў Мазырскім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя І.П. Шамякіна.

**18** – 120 гадоў з дня нараджэння Апанскага Іосіфа Каземіравіча (1897г., Літоўская ССР - 07.06.1927г.; партыйны псеўданім Краўчынскі, Міхайлаў), старшыні Мазырскага паветнага рэвкама.

## Жнівень

**22** – 90 гадоў з дня нараджэння Сенькіна Івана Андрэевіча (22.08.1927г. - 19.04.1960г.), супрацоўніка міліцыі, загінуўшага пры выкананні службовых абавязках. На будынку Мазырскага аддзела ўнутранных спраў устаноўлена мемарыяльная дошка.

## Верасень

**12** – 120 гадоў з дня нараджэння Залескага Паўла Якаўлевіча (н. 12.09.1902г., в. Нагорные Мазырскага раёна - 16.12.1970г.), генерал-маёр (1943г.). З 1939 г. інжынер навукова-тэхнічнага кіравання ваенна-паветранных сіл.

http://gallery.mozyrlib.by/

## Кастрычнік

**4** – 125 гадоў з дня нараджэння Пашкоўскага Віктара Міхайлавіча (н. 1897г., в. Скрыгалаў Мазырскага раёна - 1970г.), генерал-маёр (1942 г.). У Чырвонай Арміі з 1918 г., удзельнік грамадзянскай вайны (1919-1921г.г.), перад вайною - начальнік ваеннага забяспячэння 24-й стралковай дывізіі (1935г.). У 1943-1944 гг. начальнік тыла 32-й і 39-й арміі.

**5** – 75 гадоў з часу заснавання (1947г.) ГПТВ - 68 будаўнікоў. З 2013 года - Мазырскі дзяржаўны прафесійны ліцэй № 2 будаўнікоў.

**14** – 85 гадоў з дня нараджэння Рудзінскага Уладзіміра Феліксавіча (н. 14.10.1937г., в. Дразды Мазырскага раёна - 2016г.). Працаваў намеснікам дырэктара Крушнікскай школы, карэспандэнтам у Калінкавіцкай і Мазырскай газетах Быў уласным карэспандэнтам Рэспубліканскага радыё (1974-1998гг.). Да 2005 года з'яўляўся рэдактарам Бабруйскага раённага радыё.

**20** – 55 гадоў з дня нараджэння (1967г.) Андрыеўскага Васіля Рыгоравіча (н. 20.10.1967г., в. Града Калінкавіцкага раёна), беларускага паэта.

**26** – 120 гадоў з часу (1902г.) заснавання ў г. Мазыры гарадскога камітэта РСДРП.

**28** – 70 гадоў з дня нараджэння Сухавей Святланы Іванаўны (н. 28.10.1952г., г. Мазыр), беларускай актрысы тэатра і кіно. Заслужаная артыстка Беларусі (1999г.).

## Лістапад

**1** – 95 гадоў з дня нараджэння Гусака Аляксея Адамавіча (н. 1.11.1927г., в. Іванкаўшчына Мазырскага раёна), беларускага матэматыка. Кандыдат фізіка-матэматычных навук (1956г.), прафесар (1976г.), дэкан матэматычнага факультэта БДУ (1963 - 1974гг.).

**1** – 85 гадоў з дня нараджэння Верамейчыка Уладзіміра Міхайлавіча (н. 01.11.1937г., в. Петрыцкае Брагінскага раёна - 26.12.1999г.), паэта, педагога. Вучыўся ў Мазырскім педагагічным вучылішчы, працаваў настаўнікам Міхалкаўскай школы (1955г.).

**6** – 100 гадоў (1922г.) з дня правядзення сходу сялян Мазырскага павета.

## Снежань

**1** – 55 гадоў (1962г.) з часу ўмацавання Мазырскага раёна. У склад яго увайшлі 28 населенных пунктаў.

http://gallery.mozyrlib.by/



















**Складальнік і камп'ютарны набор: Цюленева Н.В.**